**Установа адукацыі**
**«Беларускі дзяржаўны педагагічны**
**ўніверсітэт імя Максіма танка»**

Факультэт беларускай і рускай філалогіі
Кафедра беларускай літаратуры і культуры

# Праблема памяці ў творах Віктара Казько “Суд у слабадзе” і Янкі Сіпакова “Крыло цішыні

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Курсавая работа
студэнткі 21 групы
2 курса спецыяльнасці
«Беларуская мова і літаратура»
дзённай формы
атрымання адукацыі
_________Міхеевай
Наталлі Васільеўны

Дапушчана да абароны

Загадчык кафедры ______ _________

Пратакол № _____ад ________2016 г.

Абаронена ________________2016 г.
з адзнакай «____________________»

Навуковы кіраўнік –
кандыдат філалагічных
навук, дацэнт
__________Н.В. Заяц

Мінск, 2016

**ЗМЕСТ**

УВОДЗІНЫ …………………………………………………………………………3

РАЗДЗЕЛ I Спецыфіка мастацкага даследавання праблемы памяці ў творы Віктара Казько “Суд у Слабадзе”……………………………………………………..5

РАЗДЗЕЛ II Памяць пра вайну ў аповесці Янкі Сіпакова “Крыло цішыні”: асаблівасці творчага ўвасаблення………………………………………………………12

ЗАКЛЮЧЭННЕ……………………………………………………………………..23

БІБЛІЯГРАФІЧНЫ СПІС…………………………………………………………..24

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# УВОДЗІНЫ

Вайна – катастрофа, найвялікшая трагедыя, якая нясе непамерны жах, нечалавечыя пакуты і смерць людзям. У гэтым і пераконвае чытачоў сусветная і беларуская “ваенная” літаратура, паняцце “вайна” ў якой з’яўляецца надзвычай трагічным ідэйным цэнтрам. Праблема памяці пра ваеннае мінулае знайшла сваё ўвасабленне і мастацкае даследаванне ў шматлікіх творах беларускай літаратуры, асабліва ў набытку прадстаўнікоў так званага філалагічнага пакалення. Такое найменне ў беларускім літаратуразнаўстве замацавалася за тымі пісьменніў, што прыйшлі ў мастацкую творчасць з філалагічных факультэтаў у 1960-я гг. Дзяцінства гэтых аўтараў прыпала на час ваеннага ліхалецця. Праблема абпаленага вайной маленства, праблема памяці сталі цэнтральнымі ў іх творчасці.

Вельмі значны пласт беларускай мастацкай прозы ўяўляюць творы пра вайну, вобразнае асэнсаванне якой было пачата па свежых слядах К. Чорным. Пазней ваенная тэма разглядалася непасрэднымі ўдзельнікамі тых падзей І. Мележам, І. Шамякіным, А. Адамовічам, Я. Брылём, В. Быкавым... Яны вярталіся ў вогненныя гады, робячы усё новыя спробы па-мастацку асэнсаваць, што адбывалася з імі самімі і з цэлым народам у час вялікага і смяротнага сутыкнення дабра і зла. Асаблівай актуальнасцю былі пазначаны аповесці В. Быкава, якія выходзілі ў свет адна за адной, штораз выклікаючы хвалю цікавасці да ўзнятай аўтарам-першаадкрывальнікам маральнай праблематыкі, дзе цэнтральнае месца займае праблема выбару.

Спецыфічным падыходам да раскрыцця ваенных падзей праз дзіцячае ўспрыманне характарызуюцца мастацкія пошукі паэтаў і празаікаў, чыё дзяцінства было апалена вайной. Сярод іх Г. Бураўкін, В. Зуёнак, Р. Барадулін, Я. Сіпакоў, В. Адамчык, Б. Сачанка, В. Казько і многія іншыя паэты і празаікі.

Дзеці – апошнія сведкі мінулых трагічных падзей. Пасля іх не застаецца нікога, хто так востра і балюча іх перажываў. Яны старэйшыя за сваю дзіцячую памяць: калі дарослая памяць дае аб’ёмны малюнак мінулага, то ў дзіцячую перажытае ўразаецца ўспышкамі, выхопліваючы найбольш яркія, трагічныя і жудасныя моманты вайны. У блізкім суседстве са смерцю дзеці станавіліся па-дзіцячы дарослымі і мудрымі.

Па сваіх светапоглядных арыентацыях пісьменніцкае пакаленне “дзяцей вайны” набліжаецца да так званага “страчанага пакалення”, прадстаўнікамі якога з’яўляліся Э. Хемінгуэй, Р. Олдзінгтан, Э.М. Рэмарк і іншыя пісьменнікі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

што ў 1920-я гг. выступілі з творамі, у якіх адлюстраваліся расчараванне ў сучаснай цывілізацыі і страта веры ў станоўчую сілу навуковага прагрэсу, сацыяльную справядлівасць, сілу норм гуманнасці і маралі. Гэтыя эмоцыі і пачуцці абвастрыліся, паглыбіліся пад уплывам трагічнага вопыту Першай сусветнай вайны.

Разам з тым падыходы ў паказе вайны, ужо Другой сусветннай, значна адрозніваюцца. Выяўленню гэтых адметнасцей, вывучэнню асаблівасцей мастацкага адлюстравання ваеннага мінулага і прысвечана курсавая работа.

**Мэта курсавой работы** – даследаваць спецыфіку мастацкага ўвасаблення памяці пра вайну ў творах Віктара Казько “Суд у Слабадзе” і Янкі Сіпакова “Крыло цішыні”.

Дасягненне пастаўленай мэты патрабуе рэалізацыі наступных **задач**:

1) вывучыць крытычную літаратуру па тэме даследавання;
2) выявіць і прааналізаваць адметнасць мастацкага даследавання праблемы памяці ў творы В. Казько “Суд у Слабадзе;
3) даследаваць асаблівасці творчага ўвасаблення праблемы памяці пра ваеннае дзяцінства ў аповесці Я. Сіпакова “Крыло цішыні”;
4) вызначыць агульнае і адрознае ў мастацкім спасціжэнні праблемы памяці ў творах В. Казько і Я. Сіпакова.

**Прадмет даследавання** – праблема памяці ў творах Віктара Казько “Суд у Слабадзе” і Янкі Сіпакова “Крыло цішыні”.

**Аб’ект даследавання** – творы “Суд у Слабадзе" Віктара Казько і “Крыло цішыні” Янкі Сіпакова.

Курсавая работа складаецца з уводзін, двух раздзелаў (“Спецыфіка мастацкага даследавання праблемы памяці ў творы Віктара Казько «Суд у Слабадзе»” і “Памяць пра вайну ў аповесці Янкі Сіпакова «Крыло цішыні»: асаблівасці творчага ўвасаблення”, заключэння і бібліяграфічнага спіса.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

Разгледзеўшы такую складаную і няпростую праблеу, як праблема памяці, менавіта памяці пра вайну, прааналізаваўшы цяжкі лёс Віктара Казько і Янкі Сіпакова, дзяцінства якіх было апалена вайной і наклала адбітак на іх творчасць, можна прыйсці да вывадаў, што гэта вельмі таленавітыя і моцныя духам людзі, бо яны прайшлі гэтую школу выжывання і пабачылі ўсе жахі вайны на свае вочы.

У гэтай працы мы разгледзелі два творы: “Суд у Слабадзе” В. Казько і “Крыло цішыні” Я. Сіпакова. Абодва творы вельмі цікавыя, у іх закрануты праблемы цяжкага жыцця падлеткаў у дзіцячым доме (“Суд у Слабадзе”), а таксама пасляваеннага жыцця, калі ў вёсках не было здаровых мужчын, бо яны прыходзілі з вайны інвалідамі, а працаваць павінны былі жанчыны і падлеткі (“Крыло цішыні”). Гэтыя творы аўтабіяграфічныя. Многія рысы галоўных герояў уласцівы самім аўтарам: Колька Лецечка, як і В. Казько, выхоўваўся ў дзіцячым доме, бо вайна забрала ў яго сям’ю; падобны таксама Янка Сіпакоў і Ясь: абодва ў падлеткавым узросце працавалі паштальёнамі і выхоўваліся ў цёткі, бо бацькоў забілі немцы.

У сваёй працы мы дасягнулі пастаўленай мэты: даследаваць спецыфіку мастацкага ўвасаблення памяці пра вайну ў творах Віктара Казько “Суд у Слабадзе” і Янкі Сіпакова “Крыло цішыні”.

У ходзе нашага даследавання асаблівая ўвага надавалася пытанням псіхалогіі дзіцяці, асаблівасцям увасаблення пісьменнікамі ўласнага вопыту, спецыфіцы ўспрымання і “ператварэння” падзей ваеннага мінулага, што дазваляе ўбачыць праблему ў новым ракурсе.

У жыцці кожнага грамадства існуюць перыяды, калі гісторыя становіцца больш актуальнай за сучаснасць. Гэтак бывае кожны раз, калі сучаснасць не здольная адказаць на пытанні – і тады чалавек у патрэбе ісціны звяртаецца да таго, што ўжо адбывалася.

Аўтабіяграфічныя аспекты жыццёвага шляху Віктара Казько ўвасабляюцца ў аповесці “Суд у Слабадзе”. Вобраз яе героя, Колькі Лецечкі, які ўвабраў у сябе ўсю цяжкую памяць, боль і пакуты “дзяцей вайны”, надзелены вострым, болевым успрыманнем свету, крайняй праўдзівасцю перад сабой і іншымі, няўтольнай смагай да дабра і жыцця, нянавісцю да зла, высокім пачуццём адказнасці і трывогі за чалавека і чалавецтва. Такім чынам, трагічная

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

гісторыя былога вязня фашысцкага “кіндэрхайа” прадстаўляе перад сабой нешта большае, чым проста ўспаміны пра перанесеныя пакуты.

Аўтабіяграфічнай з’яўляецца аповесць Янкі Сіпакова “Крыло цішыні”. У гэтым творы увага надаецца тым супярэчнасцям, якія суправаджаюць пераадоленне героямі вынікаў ваеннага мінулага. Янка Сіпакоў, ствараючы вобраз Яські, не ўтойвае перашкод, якія пераадольвае хлопчык-сірата на шляху да гармоніі з акаляючым асяроддзем – а гэта вялікая маральная праца ва ўсведамленні “дзяцей вайны”, якія бяруць сілы ў этычных каштоўнасцях.

Індывідуальны вопыт пісьменнікаў дазваляе ім з максімальнай глыбінёй адлюстраваць як празмерныя пакуты дзяцей, так і пошук імі шляхоў пазбаўлення ад прыгнятальных вынікаў вайны. Гэта паказ ваеннага дзяцінства “знутры”.

У роздумах літаратуры над “вечнымі” пытаннямі быцця, у пошуку сэнсу жыцця, чалавечых учынкаў і ахвяр, вялікае значэнне мае тое, што сказалі на карысць міру беларускія празаікі з пакалення дзяцей вайны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# БІБЛІЯГРАФІЧНЫ СПІС


1. Андраюк, С. Жыць чалавекам : літаратурна-крытычныя артыкулы / С. Андраюк. – Мінск : Маст. літ., 1983. – 211 с.
2. Аннинский, Л. Полная цена : творческий портрет Виктора Козько / Аннинский // Нёман. – 1980. – № 2. – С.180–186.
3. Бельскі, А. Сучасная беларуская літаратура: станаўленне і развіццё творчых індывідуальнасцяў (80-90 гг.) : дапаможнік для настаўнікаў / А. Бельскі. – Мінск, 1998. – 170 с.
4. Васюченко, П. Война и детство. Художественное освоение проблемы в белорусской прозе 60–70-х годов / АН БССР, Ин-т лит. им. Я. Купалы. – Минск, 1985. – 19 с.
5. Васючэнка, П.В. Віктар Казько / П.В. Васючэнка // Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя : у 4 т. Т.4. Кн.1: 1966–1985. – Мінск : Маст. літ., 2002. – С. 729–749.
6. Васючэнка, П. Детство помнит // Нёман. – 1985. – № 6. – С. 163–165.
7. Васючэнка, П. Крыж пакутаў і памяці : творчы партрэт Віктара Казько // Полымя. – 1997. – № 7.
8. Гоўзіч, І. Максім Гарэцкі і Янка Сіпакоў: да праблемы стылёвага падабенства / І. Гоўзіч // Роднае слова. – 2003. – № 2. – С. 16–19.
9. Грыцаль, Т. Беларуская літаратура ў школе: вывучэнне сучаснай прозы ў старшых класах / Т.М. Грыцаль. – Мінск : Тэхнапрынт, 2004. – 20 с.
10. Давідоўская, Л. Янка Сіпакоў / Л. Давідоўская // Роднае слова. – 2004. – № 7. – С. 100–102.
11. Дадонава (Іванова), Н. Вайна вачыма дзяцей у прозе ХХ стагоддзя / Н. Дадонава (Іванова) // Сёмыя танкаўскія чытанні. Да 95-годдзя Беларускага дзяржаўнага педагагічнага унівесітэта імя Максіма Танка : зб. навук. арт.; рэд. кал: Г.Я. Адамовіч, Д.В. Дзятко, А.У. Жардзецкая і інш.; адк. рэд. Ф.С. Шумчык. – Мінск, 2010. – С. 23 –27.
12. Дзягцяр, Н. Творчасць Віктара Казько : праблемы стылю / Н. Дзягцяр // Весці АН Беларусі. – 1994. – № 2. – С. 98–104.
13. Жук, В. За ўсё на зямлі ёсць суд… / В. Жук // Беларусь. – 1982. – № 3. – С. 29.
14. Жук, В. За ўсё на зямлі ёсць суд… : гутарка з В. Казько / В. Жук // Беларусь. – 1982. – № 3. – С. 28–31.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

15.Казько, В. Бягу і вяртаюся // Памяць : гіст.-дакум. хроніка Жыткавіцкага раёна ; рэд.-укл. В.Р. Феранц. – Мінск, 1994. – С. 762–765.
16.Казько, В. Суд у Слабадзе : аповесць / В. Казько. – Мінск : Маст. літ., 2007. – 268 с.
17.Казько, В. Я вам ніколі не хлусіў / В. Казько // Крыніца. – 1997 – №12. – С. 12–17.
18.Казько, В. Я вам ніколі не хлусіў // Крыніца. – 1997. – № 12. – С. 12–17.
19.Козько, В. Цепочка памяти // Вопросы литературы. – 1983. – № 5. – С. 173.
20.Лойка, А. Памераўшы на крылы акіян / А. Лойка // Паэзія і час : літаратурна-крытычныя артыкулы, творчыя партрэты. – Мінск, 1981. – С. 45
21.Наваградская, Н. Проза А. Кудраўца, В. Карамазава і В. Казько: праблема творчай індывідуальнасці / АН Рэсп. Беларусь, Ін-т літ. ім. Я. Купалы. – Мінск, 1996. – 24 с.
22.Нуждзіна,Т. Загадка Віктара Казько / Т. Нуждзіна // Полымя. – 1999. – № 2. – С. 192–206.
23.Саламаха, У. Закон раўнавагі Янкі Сіпакова / У. Саламаха // ЛіМ. – 2003. – 24 студз. – С. 4–5.
24.Санюк, Д.К. Янка Сіпакоў / Д.К. Санюк // Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя : у 4 т. Т.4. Кн.1: 1966–1985. – Мінск : Маст. літ., 2002. – С.675– 694.
25.Сіпакоў, Я. Веча славянскіх балад / Я Сіпакоў. – Мінск : Маст. літ. 1988. – 263 с.
26.Сіпакоў, Я. Крыло цішыні. Кніга вёскі / Я Сіпакоў. – Мінск : Маст. літ. 1976. – 476 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ